

*Ліпскі касцёл Дзевы Марыі.*

каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь. Касцёл дзейнічае. *А.М.Каласоўская.*

**ЛІПСКІ НАРО́ДНЫ ХОР.** Створаны ў 1956 у в. Ліпск Ляхавіцкага р-на пры сельскім Доме культуры. У 1986 прысвоена званне «народны аматарскі калектыў». Кіраўнікі: А.А.Санько (з 1956), Р.К.Зыбайла (з 1962), А.Я.Кабылянская (з 1972), С.В.Дыдышка (з 1976). У складзе хору 20 чал. ва ўзросце ад 34 да 65 гадоў. У рэпертуары: бел. нар. песні «Ліпская сербіянка», «Пасею агурочкі», «Два галубы», «Ой, у мяне чорны бровы», «Прадаў ляснік», «І сюды гара, і туды гара», «У агародзе вярба расла»; творы бел. кампазітараў «Ліпск мой дарагі» С.Сазановіча, «Развітальная», «Наша свята» Э.Сіліцкага, «Застольная» І.Капланава, «Беларусь — імя святое» А.Траццякова, «Дажыначкі», «Родная хата» Л.Захлеўнага, «Вёсачка», «За маладых» М.Алешкі, «Сто гадоў» М.Сацуры і інш. Калектыў — удзельнік абл. фестывалю вак.-харавога мастацтва «Ляці, наша песня», фестывалю-кірмашу «Дажынкі» (г. Ляхавічы, 2013) і інш. *Г.С.Пішчака.*

**ЛІ́ПЧЫК** Міхаіл Яўстаф'евіч (н. 7.5.1955, г. Глыбокае), беларускі баяніст. Засл. артыст Беларусі (1989). Скончыў Бел. кансерваторыю (1982). З 1980 у Дзярж. нар. аркестры Беларусі імя І.І.Жыновіча, з 1982 у Дзярж. акадэмічным нар. хоры Беларусі імя Г.І.Цітовіча, з 1993 у Бел. ансамблі нар. музыкі «Свята». У 1996—2002 (з перапынкам) у Дзярж. ансамблі танца Беларусі. Выкананню Л. характэрны высокая тэхнічнасць, эмацыянальнасць, багацце нюансіроўкі.

**ЛІ́РА,** с т а р э ц к а я   с к р ы п к а, б а н д у р а, к о б з а, народны струнны музычны фрыкцыйны інструмент. Мае драўляны корпус рознай (прамавугольнай, авальнай) формы, на верхняй дэцы якога нацягнуты 3 жыльныя струны, замацаваныя калкамі. Даўжыня гучальнай часткі 1-й струны рэгулюецца націсканнем на яе 4—5 драўлянымі палачкамі-клавішамі. Пры гэтым астатнія 2 струны вытрымліваюць нязменны ўнісон. Гук узнікае ў працэсе трэння аб струны гладкага плоскага кола, якое прыводзіцца ў рух пры дапамозе жалезнай ручкі. Бел. Л. мае ад 3—5 да 13 клавіш і 3—4 струны. Бурдонныя струны (крайнія) узнаўляюць квінту, а меладычная — настроена ў актаву з ніжнім бурдонам. Пры наяўнасці 4 струн — 2 з іх выконваюць меладычную функцыю. На Л. іграюць седзячы, трымаючы яе на каленях, альбо стоячы (Л. мацуецца на рэмені, перакінутым цераз плячо, калкі інструмента зарыентаваны ўлева і з нахілам ад музыканта, з мэтай вярнуць клавішы пасля націскання на ранейшае месца). Своеасаблівая меланхалічна-манатонная, тужлівая гарманічная мелодыя Л. надавала голасу спевака пэўную ўрачыстасць. Сярод звестак аб прафесіях 2-й пал. 17 ст. ўзгадваюцца *лірнік* і жабракі, якія выконвалі духоўныя вершы, псальмы, гіст., сац.-быт. песні ў суправаджэнні Л. У наш час інструмент, які значна ўдасканалены (мае храматычны гукарад і дыяпазон у 2 актавы), выкарыстоўваюць прафес. і аматарскія калектывы маст. самадзейнасці. Л. арганічна дапаўняе і пашырае муз. магчымасці сучасных нар. інструм. ансамбляў.

*Літ.*: Н а з і н а І.Д. Беларускія народныя музычныя інструменты. Мінск, 1997.

*А.М.Аляхновіч.*

**ЛІ́РА-ЭПІ́ЧНАЯ ПАЭ́МА,** жанравая разнавіднасць *паэмы*, у якой арганічна яднаюцца лірычны і эпічны спосабы пазнання і ўвасаблення рэчаіснасці. У л-ры ўзнікненне Л.-э.п. звязваецца з эпохай рамантызму, яго адметнай цікавасцю да асобы творцы. У паэме побач з дамінуючым эпічным пачаткам выяўляецца драм. пафас апавядання і асабістаацэначны светапогляд аўтара-апавядальніка. Узорамі Л.-э.п. ў бел. л-ры з'яўляюцца «Песня пра зубра» Міколы Гусоўскага (1522), «Бандароўна», «Магіла льва» Я.Купалы (абедзве 1913), «Новая зямля» (1911—23), «Сымон-музыка» (1911—25) Я.Коласа, «Нарач» (1937) М.Танка, «Сцяг брыгады» (1943), «Цунамі» (1968) А.Куляшова і інш. У 1980—90-я гг. ў жанры Л.-э.п. былі напісаны «Балючая памяць» С.Грахоўскага (1987), «Чорная быль» С.Законнікава (1989), «Знакі» Ю.Голуба» (1990) і інш. Сучасная Л.-э.п. аператыўна адгукаецца на ўсе складаныя і драм. перыпетыі нар. быцця («Няходжанае поле» М.Мятліцкага, 2001; «Ра» А.Бадака, 2003; «Ён» С.Законнікава, 2004; «Жыцень» Л.Дранько-Майсюка, 2006 і інш.). *С.М.Тарасава.*

**ЛІ́РНІК,** жабрак-музыка, які выконваў духоўныя вершы, псальмы, гіст., сац.-быт. песні сольна ці ў суправаджэнні *ліры*. Найчасцей гэта быў чалавек з пэўным фіз. недахопам (сляпы, кульгавы і інш.). Яго звычайна суправаджаў хлопчык (або інш. павадыр), якога Л. карміў і апранаў. У 17 ст. ў Беларусі з'явіліся лірніцкія цэхі. У Мінскай губ. Л. ўваходзілі ў

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

т.зв. жабрацкі цэх, які меў выбарнага цэхмістра, свае правілы і спец. жабрацкую мову. У цэх прымалі толькі вучняў з фіз. недахопамі. Абавязковымі былі вучоба ў аднаго з чл. цэха, унясенне пэўнай сумы ў цэхавую касу, плата за навуку, экзамен, а таксама абрад пасвячэння ў Л. Імя будучага Л. і сума першага грашовага ўзносу фіксаваліся выбарнай асобай — ключнікам — у спец. сшытку. Той, хто правініўся падчас вучобы, павінен быў купіць воск для брацкай свечкі. У асобных выпадках жабраку «абразалі» торбу, г.зн. выключалі з цэха. На заключным экзамене настаўнік прымаў ад вучня цілушкі — 3 акрайчыкі хлеба, якія пасыпаў соллю і клаў сабе за пазуху. Затым пры пэўнай абраднасці ліра з шыі настаўніка перавешвалася на шыю вучня. З гэтага моманту апошні меў права насіць інструмент. Л. хадзілі звычайна падчас пастоў, кірмашоў, фэстаў, у перыяд восеньскіх прац у полі. Трымаліся па адным, удвух або групай па 3—4 чал. з агульным павадыром, часам ездзілі на конях. За сваю справу Л. атрымлівалі грошы або ежу. Некаторыя з іх займаліся настаўніцтвам. У народзе Л. называлі божым чалавекам і часта можна было пачуць: «... можа і мы ў свае галовы... будзем разумець штонебудзь лаўчэйшае». Маст. творчасць Л. — цэлая эпоха ў гісторыі развіцця бел. нар. муз. культуры.

*Літ.*: Грузинский А.Е. Из этнографических наблюдений в Речицком уезде Минской губернии // Этнографическое обозрение. 1891. Кн. 2.

*А.М.Аляхновіч.*

**ЛІ́РНІЦКІЯ ПЕ́СНІ**, творы, якія ўваходзілі ў рэпертуар *лірнікаў*. Да іх адносіліся псальмы, уласна лірніцкія духоўна-рэліг., быт. лірычныя і ліра-эпічныя, сатыр. і гумарыст. песні. У Беларусі аснову рэпертуару лірнікаў складалі духоўныя вершы. Першапачаткова іх аўтарамі і выканаўцамі з'яўляліся спевакі царк. хароў, настаўнікі спеваў брацкіх школ, студэнты калегіумаў, з цягам часу — лірнікі, кабзары, рамеснікі, салдаты. У народзе Л.п. называліся псальмамі і былі адгалінаваннем кантаў. Яны мелі рэліг. змест духоўна-маралізатарскага характару («Плач Адама», «Лазар»), якія А.Багдановіч і Я.Карскі дзялілі на некалькі груп. Паступова рэліг. сюжэты напаўняліся свецкімі матывамі і з цягам часу з'явіліся лірычныя, пастаральныя, парадыйныя, жартоўныя Л.п., якія, тым не менш, не змаглі канчаткова выцесніць духоўны рэпертуар лірнікаў. На працягу іх існавання выконваліся духоўныя вершы, прысвечаныя святым Ягорыю, Аляксею, Васілію, Варлааму і псальмы (Міхайлаў, Пачаеўскай Божай Маці). Псальмы часта выконваліся ў ходзе *стаўбавога абрада* і былі вядомыя як стаўбавыя песні. Шмат Л.п. узнаўлялася падчас каляндарных свят — Каляд (Раства Хрыстова) і Вялікадня (Пасхі). Усе псальмы, што спяваліся на гэтыя святы, — варыянты твораў на сюжэты нараджэння і ўваскрасення Ісуса Хрыста. Аднак змест кожнага з іх раскрываўся па-новаму, кожнай псальме ўласцівы прыгажосць і арыгінальнасць. У той жа час у некаторых з іх урачыстасць нараджэння Збавіцеля («Максім стары, барадаты») афарбоўвалася нар. гумарам: «Прыйшлі да Его пастыре // І зайгралі на ліре. // Два Літвіны із Дывін // Прынеслі гаршчок ботвін // А Юзеф стоіт под акном, // Держіт міску з толокном...//. Кульмінацыяй псальмаў аб жыцці Хрыста стала апісанне пакут маці Хрыста — Марыі ў сувязі з яго распяццем. Асобныя Л.п. захаваліся да нашых дзён і з'яўляюцца цікавым пазнавальным матэрыялам у справе вывучэння жыцця, культуры і побыту народа за некалькі апошніх стагоддзяў.

*Літ.*: Грузинский А.Е. Духовные стихи (Минская губ. Речицкий у.) // Этнографическое обозрение. М., 1898. №3; Костюковец Л.Ф. Кантовая культура Белоруссии. Минск, 1975.

*А.М.Аляхновіч.*

**ЛІ́РЫКА** (ад грэч. lyricos які вымаўляецца пад гукі ліры, музычны, напеўны), адзін з родаў літаратуры (побач з *эпасам, драмай*), які адлюстроўвае духоўнае жыццё чалавека, свет яго ідэй, пачуццяў і служыць творчаму самасцвярджэнню асобы як узвышана-прыгожай істоты. Узнік у старажытнасці. У найб. ступені адлюстроўвае суб'ектыўныя перажыванні чалавека. У эстэтычнай структуры лірычнага твора чалавек можа прысутнічаць як аўтар, аб'ект і суб'ект адлюстравання. Як феномен паэзіі Л. супрацьпастаўлена *прозе*. Разам з тым яна ўзаемадзейнічае з эпасам і драмай (т.зв. лірызм), праявай чаго з'яўляюцца: *лірычныя адступленні*, асаблівая эмацыянальная насычанасць твораў, прасякнутасць іх аўтарскімі пачуццямі. У лірычных творах можна выявіць элементы эпасу (зачаткі сюжэта) і драмы (напружанасць думкі і пачуцця, дыялагічная форма выяўлення). На памежжы Л. і эпасу, Л. і драмы ўзніклі асобныя віды л-ры: *раман вершаваны*, *аповесць*, *апавяданне*, *паэма*, *драматычная паэма*, *балада*, *байка* і інш. Індывідуалізаваны і тыпізаваны малюнак духоўнага свету сучасніка Л. ўвасабляе ў вобразе *лірычнага героя* паэта. Лірычны герой (лірычнае «Я») — тэрмін умоўны, бо яго вобраз нельга цалкам атаясамліваць з асобай паэта, ягоныя перажыванні, пачуцці, думкі — цалкам з аўтарскімі. У Л. вылучаюцца наступныя віды (і падвіды): *верш* (*санет*, *трыялет*, *акраверш*, *александрыйскі верш*, рубаі, *газель*, *тэрцыны*, *актава*, *рандо*), *песня*, *лірычная паэма*, празаічная мініяцюра (лірычная), *пародыя* і інш. Выпрацавана шматстайная жанравая сістэма Л. у залежнасці ад канкрэтнага зместу лірычных твораў вылучаецца Л.: абрадавая (*зімовыя песні*, *веснавыя песні*, *летнія песні*, *восеньскія песні*, *талочныя песні*, *радзінныя песні*, *вясельныя песні*, *галашэнні*); пазаабрадавая (*калыханкі*, *пацешкі*, *скорагаворкі*, *лічылкі*, *прыказкі*, *загадкі*, *замовы*, *песні пра каханне*, сямейна-быт., жартоўныя, вайсковыя, сацыяльна-быт. песні, *прыпеўкі*); духоўная [духоўныя

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ